УДК 630*9; 630*12; 630*57; 630*63

Студ. Я.В. Тухта
Навук. кіраўнік дац. С.І. Мінкевіч
(кафедра лесаўпарадкавання БДТУ)

# АСАБЛІВА АХОЎВАЕМЫЯ ПРЫРОДНЫЯ ТЭРЫТОРЫІ ЛЕПЕЛЬСКАГА ЛЯСГАСА

У рабоце прыводзяцца кароткія звесткі пра Лепельскі лясгас; аналізуюцца структура і адметнасці асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый (ААПТ), што размешчаны на тэрыторыі дзяржаўнага ляснога фонду ўстановы і знаходзяцца пад аховай лясгаса. Даследаванні прыродных каштоўнасцяў ААПТ, рэжымаў лесакарыстання маюць значнае тэарэтычнае і практычнае значэнне ў сувязі з ростам цікавасці грамадскасці да такіх каштоўных аб’ектаў, неабходнасці захавання ўнікальных прыродных аб’ектаў і відавой разнастайнасці, новых тэндэнцый развіцця сеткі каштоўных прыродных аб’ектаў ў нацыянальным і агульнаеўрапейскім кантэксце.

Лясны фонд Лепельскага лясгаса размешчаны ў паўднёвай частцы Віцебскай вобласці на тэрыторыі Лепельскага, Чашніцкага і Сенненскага адміністрацыйных раёнаў [1]. Глебы лясгаса ў асноўным дзярнова-падзолістыя і тарфяна-балотныя – найбольш прыдатныя для росту асноўных лесаўтваральных парод: сасны, елкі, бярозы, вольхі чорнай, асіны. Агульная плошча лясгаса - 95,9 тыс. га, з іх пакрытая лесам плошча - 85,9 тыс. га. У склад лясгаса ўваходзяць 8 лясніцтваў, лесапункт, лясны гадавальнік, лесапаляўнічая гаспадарка [1].

На тэрыторыі дзяржаўнага ляснога фонду Лепельскага лясгаса знаходзіцца 2 помніка прыроды і 6 заказнікаў (табліца) [1, 2].

**Табліца – Структура ААПТ Лепельскага лясгаса**

| Аб’ект ААПТ | Плошча, га | Доля плошчы ААПТ, % |
|---|---|---|
| Помнік прыроды «Цар-дуб» | меней 0,01 | - |
| Помнік прыроды «Змеяў камень» | 0,02 | 0,001 |
| Заказнік «Какісіна» | 132,2 | 7,1 |
| Заказнік «Клецішча» | 746,6 | 39,9 |
| Заказнік «Пышнагоры» | 778,7 | 41,6 |
| Заказнік «Хвашчовае» | 124,2 | 6,7 |
| Заказнік «Зялёное лядо» | 86,1 | 4,6 |
| Заказнік «Ліпнікі» | 1,3 | 0,1 |
| Разам | 1869,3 | 100,0 |

Статус помніка прыроды «Цар-дуб» (у вёсцы Тадуліна Лепельскага раёна) быў нададзены ў 1963 годзе. На сёняшні дзень аб’ект аховы ўяўляе сабой дрэва ўзростам 450 гадоў, вышынёй 27 м., дыяметрам 170 см. Знаходзіцца пад аховай Валасовіцкага лясніцтва.

Геалагічны помнік прыроды кангламерат «Змеяў камень» (статус нададзены ў 1992 г.) знаходзіцца ў Кашынскім лясніцтве. Валун мае незвычайную форму і значныя памеры: даўжыня часткі, якая выступае на паверхню зямлі, складае 10,7 м., шырыня – 3,4 і вышыня – 3,98 м. Унікальна, што большая частка кангламерату пакрыта імхом і лішайнікамі, а зверху расце сасна. Ахоўваемая плошча - 0,02 га.

Заказнік «Какісіна» заснаваны ў 2020 годзе, знаходзіцца на тэрыторыі Каменскага лясніцтва каля вёскі Загорцы вакол возера Какісіна. Агульная плошча заказніка «Какісіна» складае 132,2 га.

На падставе звестак навуковых супрацоўнікаў Бярэзінскага біясфернага запаведніка, для захавання экасістэмы верхавога балота, у 1990 годзе было прынята рашэнне аб стварэнні гідралагічна-журавінавага заказніка, які з’яўляецца каштоўным фауністычным комплексам, мае вялікае навуковае і культурнае значэнне, з’яўляецца месцам пражывання многіх рэдкіх і знікаючых відаў жывёл і птушак, занесеных у Чырвоную Кнігу; заказнік «Клецішча» знаходзіцца на тэрыторыі Слабадского лясніцтва, займае плошчу 746,6 га.

Ландшафтны заказнік «Пышнагоры» знаходзіцца ў Стайскім лясніцтве. Створаны ў 2004 годзе з мэтай захавання ў натуральным стане каштоўных прыродна-ландшафтных комплексаў з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Агульная плошча - 778,7 га.

Геалагічны (тарфяны) заказнік «Хвашчовае» займае плошчу 124,2 га. Створаны ў 1993 годзе для захавання водарэгуляцыйнай здольнасці тэрыторыі; знаходзіцца пад аховай Старасельскага лясніцтва. У 1992 годзе на тэрыторыі Старасельскага лясніцтва было арганізавана адразу два біялагічных заказніка: «Зялёное лядо» (захаванне натуральнага масіва дуба звычайнага і ахоўных відаў раслін) і «Ліпнікі» (захаванне ў натуральным стане прыроднага фларыстычнага біяцэнозу) з плошчамі 86,1 га і 1,3 га адпаведна.

Такім чынам, ААПТ Лепельскага лясгаса займаюць 1869,3 га ці 1,95% ад яго агульнай плошчы (гл. табліцу). Гэтая лічба меньшая за агульнарэспубліканскі паказчык па лясгасам (каля 6,9%).

## ЛІТАРАТУРА

1. Лепельскі лясгас Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Рэжым доступу: https://www.lepelles.by. – Дата доступу: 26.05.2022.

2. Карта-схема асабліва ахоўваемых прыродн. тэрыторый. Рэжым доступу: https://park.belgosles.by/map.html. – Дата доступу: 26.05.2022.